**Касцючык В.М. (Брэст)**

## Ключавыя вобразы-матывы ў структуры вершаў Максіма Багдановіча

М. Багдановіча адносяць да залатой плеяды паэтаў-класікаў беларускай літаратуры. Жывучы далёка за межамі Беларусі, ён змог пранікнуцца духам беларускасці, перарасці час і адгукнуцца ў нашчадках. Паэзія М. Багдановіча надзвычай адметная, прасякнутая жыццесцвярджальнымі інтанацыямі, вялікай цягай да рэалізацыі новага беларускага быцця.

Каб пазнаць беларускую стыхію, М. Багдановічу недастаткова было толькі чытаць пра Беларусь; яму трэба было яшчэ вывучыць саму мову. У ёй ён бачыў найтрывалейшы мост, што паяднаў яго з радзімай, бачыў тую тканку, што нясе дух народа, трымае яго на свеце як адзінае цэлае.

На беларускай мове створана паэтам цудоўная лірыка, пранікнутая гармоніяй радкоў і сказаў, слоў і гукаў. М. Багдановіч паўстае як духоўна багатая асоба, як носьбіт ідэі беларускага адраджэння. В. Ластоўскі адзначаў: «М. Багдановіч прыехаў у Вільню ўжо як актыўны і свядомы працаўнік беларускага (крыўскага) адраджэння, глыбей сягаючы думкай у будучыню нашага народа, чым мы, працаўнікі, згрупаваныя ў цэнтры» [2, с. 54–55].

Матыў адраджэння выступае ў лірыцы М. Багдановіча адным з асноўных. Яго сэнсавае ядро найбольш выяўным паўстае ў санеце «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...». Паэт рэалізуе ў творы кампазіцыйна-моўны прыём кантрасту, які выяўляюць кантэкстуальна супрацьпастаўленыя слоўныя рады *магіла, засохлы* і – *жыццёвая сіла, ускаласіць.* Невыпадкова аўтар пераносіцца думкай у далёкі Егіпет, нездарма яго ўвагу прыцягвае чужая краіна. Жыццё ён пазнае праз параўнанне чужога са сваім. Здаецца, зусім далёкая ад літаратуры падзея: знайшлі гаршчок з зернем, якое, нягледзячы на мінулы час, раптам ажыло і буйна ўскаласіла. Але якраз яна дала жыццё вершу, пазначанаму выключнай глыбінёй думкі. І як упэўнена, жыццесцвярджальна гучыць сказ: «Вось сімвал твой, забыты краю родны!».

Матыў пошуку нацыянальных каранёў, культурнай спадчыны асабліва выразны ў нізках «Старая Беларусь» і «Места». Гістарычная спадчына дае паэту надзею на лепшую будучыню. Карані ў мінулым – гэта як права заняць месца ў еўрапейскім пантэоне. Старая Беларусь у паэтавым успрыманні выступае краінай, населенай працавітымі, адукаванымі, вольналюбівымі людзьмі. Праўдзівасць, гістарычны каларыт надаюць вершам М. Багдановіча гістарызмы: «Хай тыя ведаюць, што з'явяцца па нас, / Ўсю праўду пра жыццё у наш і пройшлы час, / Пра *войтаў, лаўнікаў*, і *райцаў*, і *паспольства*» [1, с. 86]. Ім належыць асаблівая кампазіцыйная роля ў творах.

У вершы «Перапісчык» важным тэкставым сегментам з'яўляецца параўнанне *як сіняваты дым нявідзімых кадзіл, рой хмарачак плыве.* Удала яно суадносіцца з вобразам лірычнага героя, замкнутае жыццё якога адгарадзіла ад свету. Варта засяродзіць увагу і на такіх мастацкіх дэталях, як *крыж, вузкае акенца, гусінае пяро* з дадзенага твора, *псалтыр, воск з ладанам, псальмы* з верша «Кніга». Гэтыя слоўныя рады дазваляюць свежа і непаўторна перадаць жыццё манаха-кніжніка ў старажытнай Беларусі.

Матыў прывязанасці беларуса да радзімы выяўляецца ў вершы «Слуцкія ткачыхі», прычым праз выразнае тэматычнае поле пад назвай «сваё». Названае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

поле раскрываецца слоўным радам *вясна, поле, край бору, рака, васількі.* Чужое ў вершы не разгортваецца праз слоўнае напаўненне. Персідскі лад і родны лад кантрастуюць. У рэшце рэшт перамагае роднае. І як вынік таму – у персідскія ўзоры ўплятаецца сваё. Нездарма персідскія паясы на Беларусі атрымалі назву слуцкіх. Гэта не проста слова, што адсылае да месца вырабу прадметаў; гэта нешта большае, шырэйшае, багатае на дадатковыя канатацыі. Пераўвасабленне чужога ў сваё – характэрная з'ява для творчага працэсу. Персідскі ўзор разглядаецца як тое старое, на якім арганізуецца новая форма жыцця матэрыі.

М. Багдановіч назапашвае, раскрывае, сістэматызуе сваю спадчыну пад імем Беларусь. Спадчына пададзена ў ракурсе паступовага, няспешнага адкрыцця. Аўтар парадкуе гістарычны час з уласцівай яму паслядоўнасцю.

Беларусь М. Багдановіча не ў лапцях і не ў світках. Яна з паясамі тратуараў, з цеснымі крывымі завулкамі, старасвецкімі будынкамі, купаламі, брамамі, байніцамі, шпіцамі. Прычына выбару горада як аб'екта апісання палягае ў тым, што ён найбольш пільны сведка мінулага жыцця. Згаданы слоўны рад атрыбутаў горада ізноў жа адсылае нас да старой Беларусі. Горад выступае як спадчына, што выжыла, захавалася, нягледзячы на ліхалецці. Ён робіць непарыўнай гісторыю Беларусі, бо праз пабудовы месціць у сабе розныя часавыя прамежкі. І усё ж гарадская рэчаіснасць (а выбіраецца Вільня як гістарычны цэнтр беларускага жыцця) вельмі аддаленая ад непасрэднай рэальнасці: яна пакрыта пылам стагоддзяў, выступае нямым носьбітам памяці пра мінулыя падзеі. Ключавымі ў вершы «Вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць!..» выступаюць эпітэты *старасвецкія (будынкі), старая (званіца).*

Верш «У Вільні» адлюстроўвае толькі сучаснасць. На змену статычнасці, нерухомасці старога горада прыходзіць рух. Горад паўстае як адвечны мурашнік: «Кіпіць натоўп на жорсткім вулак дне! / Снуюць хлапцы, суюшчыя рэкламы… / Разносчыкі крычаць ля кожнай брамы… / Грук, гоман, гул, – усё ракой імкне» [1, с. 97].

Матыў руху відавочны і ў кампазіцыі верша «Пагоня». Асаблівую экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць надаюць гэтаму твору дзеясловы, пытальныя і клічныя сказы. Змест верша арганізаваны на аснове кантрасту «яны і вы» – ваякі на грозных конях і тыя, што адракліся, аддалі Беларусь у палон. «Пагоня» можна ўспрымаць і як маналог самога паэта, і як яго малітву, і як зварот да сучаснікаў і наступнікаў. Старажытная Пагоня – гэта сімвал вольнай Беларусі, знакавая іпастась светлай будучыні роднага краю, гэта і сімвал руху як асновы яго адраджэння.

Гаворка пра нацыянальна-культурную адметнасць Беларусі вядзецца ў нізцы «Згукі Бацькаўшчыны», а таксама ў вершах да задуманага зборніка «На ціхім Дунаі»: «Лявоніха», «Скірпуся», «Бяседная», праз якія бачна, як прагна ўбіраў М. Багдановіч народнае слова. Дзейнасць паэта была скіравана «найперш на спрыянне беларусам зразумець саміх сябе, усвядоміць сваю самаіснасць і нацыянальную самакаштоўнасць, дапамагчы самаідэнтыфікавацца» [2, с. 232–233].

**Літаратура**

1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды . – 1992.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Максім Багдановіч. Пясняр чыстае красы : успаміны, артыкулы, прысвячэнні ; уклад. Т. Шэляговіч. – Мінск, 2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ